УДК 791.44.071.1(477)

*А. В. Бязручка*
*прафесар кафедры кіна-, тэлемастацтва*
*Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар (Украіна)*

# СТАРТ КІНАПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ АЛЯКСАНДРА ДАЎЖЭНКІ

*У гэтым артыкуле сабраны і даследаваны невядомыя і малавядомыя старонкі пачатку творчай і кінапедагагічнай дзейнасці геніяльнага ўкраінскага кінарэжысёра, сцэнарыста, кінапедагога Аляксандра Пятровіча Даўжэнкі ў Адэсе і Кіеве: у Адэскім дзяржаўным тэхнікуме кінематаграфіі Усеўкраінскага фота- і кінакіравання, на тэакінафотааддзяленні Кіеўскага мастацкага інстытута, у метадалагічных камісіях па «Рэжысёрскай справе» і «Сацыялогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі матэрыяльнай культуры, гісторыі кінамастацтва» мастацкага факультэта Кіеўскага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі.*

***THE START OF THE CINEMA-PEDAGOGICAL ACTIVITY OF OLEKSANDR DOVZHENKO***

*In this article author collects and investigates the unknown and not very well-known facts from the beginning of the creative and pedagogical activities of the genius Ukrainian film director, script writer, cinemapedagog Oleksandr P. Dovzhenko at Odesa and Kyiv: at the Odessa State Institute of Cinematography of the All-Ukrainian photo-film management, at the theatre cinema photo division of the Kyiv Artistic Institute, in methodological commissions on «Director's» and «Sociology and History of Art, History of Material Culture, History of Cinema Arts», the art department of the Kyiv State Institute of Cinematography.*

Кінапедагагічная дзейнасць геніяльнага ўкраінскага кінарэжысёра, сцэнарыста, кінапедагога Аляксандра Пятровіча Даўжэнкі пачалася ў Адэскім дзяржаўным тэхнікуме кінематаграфіі Усеўкраінскага фота- і кінакіравання — АДТК УУФКК (гады існавання — 1924–1930).

Пачатак кінапедагагічнай дзейнасці А. Даўжэнкі ў Адэскім дзяржаўным тэхнікуме кінематаграфіі даследаваў А. Шымон [1]. Асобныя аспекты педагагічнай дзейнасці А. П. Даўжэнкі разглядаліся ў працах Г. Журава [2], Н. Шудры [3], Л. Чараваценкі [4], А. Бязручкі [5; 6] і інш.

Студэнты АДТК УУФКК падчас стажыроўкі на Адэскай кінафабрыцы «абавязкова траплялі ў здымачную групу А. Даўжэнкі. Былы студэнт Георгій Жураў успамінаў, што тых, каму ўдалося стаць асістэнтамі Аляксандра Даўжэнкі, лічылі шчасліўчыкамі» [7, с. 258]. Вядома, што адным са студэнтаў-практыкантаў у першым фільме А. Даўжэнкі «Вася-рэфарматар» быў Юрый Тамарскі [4, с. 53].

Па дадзеных гісторыка кіно А. Шымона, добрыя вынікі ў педагагічнай практыцы АДТК УУФКК давала такая форма навучання, як семінарскія заняткі па профілях, якія ўключалі чытанні лекцый і дакладаў па асобных праблемах кінамастацтва і сумежных мастацтваў, выкананне практычных заданняў з наступным калектыўным аналізам, праглядам і абмеркаваннем новых фільмаў, цікавых друкаваных работ, творчых камандзіровак на Маскоўскую і Ленінградскую кінафабрыкі. Кіраваць семінарамі запрашалі Куляшова, Эйзенштэйна, Пудаўкіна, Даўжэнку [1, с. 133]. Але, хутчэй за ўсё, на думку Аляксандра Шымона, змаглі працаваць на семінарах толькі двое апошніх.

І хоць уласнай майстэрні ў А. Даўжэнкі не было, ён не забываў пра кінатэхнікум. Пацверджаннем гэтаму з’яўляюцца ўспаміны Г. Журава: «Для кіраўніцтва кваліфікацыйнымі (дыпломнымі) працамі А. Дзянісаў прыцягваў вядомых дзеячаў тэатра і экраннага мастацтва — А. Бучму, А. Даўжэнку, Г. Рашаля, Г. Тасіна, І. Кавалярыдзэ» [2, с. 4].

Каля А. Даўжэнкі ўвесь час знаходзілася прагрэсіўна настроеная творчая моладзь, якая марыла працаваць у кінематографе. Як адзначана ў рассакрэчаных Службай бяспекі Украіны (СБУ) дакументах савецкіх спецслужбаў, «Даўжэнка, працуючы на Адэскай кінафабрыцы... групаваў вакол сябе нацыяналістычна скіраваную моладзь» [8, с. 296].

Для ўзгаднення тэарэтычных распрацовак кваліфікацыйных работ студэнтаў з практычнымі пытаннямі і далейшага выпраўлення выяўленых недахопаў кіраўніцтва АДТК УУФКК укараніла сістэму папярэдняй абароны: «Толькі на працягу 1927–1928 навучальнага года кваліфікацыйная камісія правяла 22 папярэднія абароны, на якія запрашалі работнікаў кінафабрыкі (відавочна, і А. Даўжэнку)» [7, с. 259].

У АДТК УУФКК шырока ўжывалася такая форма вучобы, як асістэнтуры-стажыроўкі, якія адыгралі потым вядучую ролю ў педагагічным метадзе А. Даўжэнкі. Вялікая ўвага надавалася групе з дванаццаці рэжысёраў і аператараў, якія спецыялізаваліся на дзіцячых фільмах. Для іх Народны камісарыят адукацыі Украіны арганізаваў семінар па педагогіцы, у працы якога ўдзельнічалі Аляксандр Пятровіч Даўжэнка і Аляксандр Еўдакімавіч Карняйчук, якія чыталі лекцыі на тэмы: «Метады рэжысуры дзіцячага фільма», «Спецыфіка дзіцячага фільма», «Кіно і яго сродкі мастацкага ўплыву», «Дзіцячы сцэнар» [1, с. 133].

У адрозненне ад тэакінафотааддзялення Кіеўскага мастацкага інстытута (КМІ, гады існавання — 1926–1930), у якім да заснавання Кіеўскай кінафабрыкі галоўны акцэнт у навучанні рабілі на тэорыі мастацтва, у АДТК УУФКК прыярытэтнай у вучобе студэнтаў лічылі практыку, а таму многім студэнтам

кінатэхнікума, як напрыклад Н. Кульчыцкаму, «пашчасціла ўдзельнічаць у здымках фільмаў А. Даўжэнкі “Звенігора” і “Арсенал”» [9, с. 13].

Аднак дырэктар АДТК УУФКК Н. Харытонаў лічыў, што акцэнт на практычнай працы меў і свае негатыўныя наступствы: «Студэнты адэскага тэхнікума былі больш-менш узброены з тэхнічнага боку, але надзвычай дрэнна ў іх было з агульнапалітычнай і ідэалагічнай культурай, таксама было дрэнна з мастацкай культурай. Гэта была наша трагедыя. Тут, у Кіеве (маецца на ўвазе тэакінафотааддзяленне Кіеўскага мастацкага інстытута. — *А. Б.*) надзвычай добра было забяспечана ўсё тое, што трэба было для набыцця высокай мастацкай культуры, але надзвычай дрэнна выглядаў іншы бок справы — тэхнічная падрыхтоўка» [10, с. 286]. Пасля арганізацыі ў 1930 г. Кіеўскага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі (КДІК) Н. Харытонаў стаў яго першым дырэктарам і спрабаваў у новым інстытуце не паўтараць памылак тэхнікума.

Кіраўніцтва КМІ на чале з І. Вронам спрабавала выправіць такое становішча, а таму пасля адкрыцця ў 1928 г. Кіеўскай кінафабрыкі імкнулася прыцягваць да выкладання ў тэакінааддзеле вядучых спецыялістаў: «Прапанову выкладаць атрымаў і Даўжэнка. Аднак адшукаць дакументы, якія пацвердзілі б педагагічную дзейнасць рэжысёра ў тэакінааддзеле, пакуль не атрымалася» [7, с. 259].

У АДТК УУФКК «згрупаваўся вельмі моцны для свайго часу калектыў спецыялістаў — знаўцаў у галіне гісторыі культуры і мастацтва. У розныя часы са студэнтамі займаліся, імкнучыся перадаць ім свой вялікі творчы вопыт і веды, такія выбітныя практыкі кіно, як А. Бучма, І. Кавалярыдзэ, Г. Рашаль, А. Даўжэнка» [1, с. 129–130].

Але ўсё ж галоўную ролю ў станаўленні ўкраінскай кінаадукацыі даваеннага перыяду сыграў незаслужана забыты Кіеўскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (КДІК), узровень адукацыі ў якім быў істотна вышэйшым.

Неабходна адзначыць, што справе прыцягнення ўкраінскай моладзі да кінематографа А. П. Даўжэнка надаваў вялікую ўвагу. Так, яшчэ ў канцы 1929 г. ён заклікаў на прыёме кінамайстроў сакратарыятам ЦК ЛКСМУ: «Лозунг сённяшняга часу — нам трэба новыя кадры кінарабочых з працоўных мас, з моладзі, з камсамолу» [11].

Пасля вяртання ва Украіну з замежнай камандзіроўкі А. Даўжэнка актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы навучальных праграм для студэнтаў мастацкага аддзела КДІК: «16 лістапада 1930 года адбылося пасяджэнне метадычнай камісіі па рэжысёрскай справе. Аляксандру Даўжэнку і Мікалаю Шпікоўскаму даручылі распрацаваць на працягу дэкады (дзесяці дзён) праграмы па рэжысуры для ўсіх аддзяленняў мастацкага факультэта: рэжысёрскага, апе-

ратарскага і сцэнарнага» [12, с. 703]. На гэтым пасяджэнні была падтрымана прапанова Даўжэнкі і Шпікоўскага аб арганізацыі метадычных лекцый па мастацтве, у прыватнасці майстар-класаў Сяргея Эйзенштэйна і Дзігі Вертава. Так, адразу пасля прыезду з замежнай камандзіроўкі майстар уключыўся ў педагагічную працу КДІК. У пачатку снежня 1930 г. А. Даўжэнка працаваў не толькі ў метадалагічнай камісіі па «Рэжысёрскай справе» [12, с. 693] (старшыні камісіі — І. Боханаў, Дзіга Вертаў, Д. Мар'ян, М. Шпікоўскі і А. Вінніцкі), але і ў метадалагічнай камісіі па «Сацыялогіі і гісторыі мастацтваў, гісторыі матэрыяльнай культуры, гісторыі кінамастацтва» (старшыні камісіі — І. Врона, С. Гіляроў, Я. Саўчанка) [12, с. 693].

Як планавалася задзейнічаць Аляксандра Даўжэнку ў далейшым, мы можам зразумець з наступнага: «Вучэбная частка запрасіла для ўдзелу ў працы метадычных камісій рэжысёраў, сцэнарыстаў і рэдактараў кінафабрыкі – людзей, якія хоць і не звязаны непасрэдным выкладаннем у Інстытуце, але бясспрэчных будучых кіраўнікоў вытворчай вучобы студэнтаў на кінафабрыцы... Даўжэнкі» [12, с. 696].

Спачатку пры Кіеўскай кінафабрыцы, а потым пры КДІК арганізоўваліся гадавыя курсы сцэнарыстаў, у якіх «можна выкарыстоўваць у якасці педагагічных сіл... Даўжэнку» [12, с. 299]. «На працягу ўсіх гадоў нашага знаходжання ў інстытуце, — успамінаў вядомы ўкраінскі кінарэжысёр Цімафей Васільевіч Ляўчук, які паступіў у КДІК у 1930 г., — даўжэнкаўскі дух лунаў над намі ўвесь час. Вялікая група нашага курсу, як правіла, стажыравалася ў здымачных групах яго фільмаў "Іван" і "Шчорс"» [12, с. 299].

У пачатку 1930-х гг. Аляксандр Даўжэнка быў супраць таго, каб расцягваць курс навучання рэжысёраў кіно на некалькі гадоў: «Навучыць кінарамяству можна за год — гэтага дастаткова. Важна адчуць неабходнасць фільма. Як толькі гэта прыйдзе — трэба адразу апускацца ў яго з галавой» [13, с. 71]. Гэта быў асабісты шлях майстра ў кіно і ў вучобе сваіх студэнтаў. Даўжэнка надаваў вялікую ўвагу паглыбленню ў кінематаграфічны працэс або стажыроўку.

Даўжэнка бачыў галоўны шлях навучання студэнтаў кінаінстытута ў практычнай працы над фільмам. Але не менш важным аспектам у педагагічным працэсе для Аляксандра Даўжэнкі быў момант узнікнення задумы, а прымаючы да ўвагі тое, што для майстра з'яўляецца важным самааналіз, шырока выкарыстоўваліся шпацыры, гутаркі, дыскусіі, на якіх у нефармальнай абстаноўцы абмяркоўваліся ўсе складнікі кінематаграфічнага працэсу.

У КДІК актуальнай была тэма спецыялізацыі (ці, як тады казалі, «ухілаў») рэжысёраў кіно; укараняліся актыўныя метады вучобы, у якіх «лекцыя як

спосаб вучобы застаецца ў вельмі невялікай, мінімальнай меры. Месца лекцый займаюць, акрамя вытворчай вучобы на прадпрыемстве, семінары, лабараторныя работы, брыгады і г. д.» [12, с. 697]; спрабавалі прыцягваць да выкладання ў кінаінстытуце самых лепшых спецыялістаў украінскага кінематографа [12, с. 286].

А. Даўжэнка як творча актыўны чалавек, да таго ж член метадалагічных камісій мастацкага факультэта КДІКа, актыўна ўдзельнічаў у абмеркаванні, распрацоўцы і ўкараненні ў жыццё інстытута многіх новых педагагічных метадаў, сярод якіх праблема спецыялізацыі ў кінарэжысуры [12, с. 287]. Доказам гэтаму з’яўляецца яго выступленне на Першым агульнаўкраінскім з’ездзе Таварыства сяброў савецкага фота і кіно (ТССФК) у красавіку 1931 г., у якім ён грунтоўна аналізаваў пачаты працэс дыферэнцыяцыі кінематографа, пралікі маладых рэжысёраў, першымі фільмамі якіх станавіліся «культурфільмы»: «Пастаноўка культурфільма даручаецца часта маладому рэжысёру-пачаткоўцу, які, гледзячы на гэтую працу як на нешта другараднае, марнуючы дарма тысячы метраў плёнкі, лічыць, што ён павінен рабіць розныя рызыкоўныя эксперыменты да таго часу, пакуль яму даручаць пастаноўку мастацка-ігравога фільма» [14]. Пасля абазначэння праблемы («у выніку такіх неасцярожных адносін да працы над культурфільмам апошні трапляе на шырокі экран і не карыстаецца поспехам» [15]) А. Даўжэнка заўсёды паказваў шляхі яе вырашэння: «Культурфільм павінен мець мінімум метражу пры максімуме здымачных кропак. Ён павінен з максімальнай яснасцю паказваць факты, іх мэтанакіраванасць» [14].

Не абышоў увагай Аляксандр Даўжэнка праблемы ўкаранення «тонкіно» (гукавога кінематографа. — *А. Б.*) і развіцця ва Украіне дзіцячага фільма: «Мы сабраліся ў Кіеве і вялі гутарку з педагогамі, якія заявілі, што мы сапраўды пачынаем наступаць на вышэйшы педагагічны фронт» [16, с. 7].

Але галоўным для А. Даўжэнкі было не тое, у якой галіне рэжысуры ў будучыні будзе працаваць кінематаграфіст, а ўвогуле — ці з’яўляецца малады чалавек асобай, ці мае ён талент. Магчыма, дзякуючы гэтаму прынцыпу педагагічнага метаду Аляксандра Пятровіча Даўжэнкі з шэрагу яго вучняў выйшлі многія майстры, якія ярка праявілі сябе не толькі ў кінематографе, але і ў паэзіі, акцёрскай справе і г. д.

*Пераклад з украінскай мовы С. В. Венідзіктава*

## Спіс асноўных крыніц


1. Шимон, А. А. Начало кинообразования / А. А. Шимон // Страницы биографии украинского кино. – Київ : Мистецтво, 1974. – С. 123–140. Вернуться к статье
2. Журов, Г. Як вони починали / Г. Журов // Новини кіноекрана. – 1989. – № 6. – С. 4. Вернуться к статье
3. Шудря, М. Геній найщирішої проби. Нариси. Розвідки. Рецензії. Інтерв'ю. Публікації / М. Шудря. – Київ : Юніверс, 2005. – 382 с. Вернуться к статье
4. Череватенко, Л. Хто ж такий Тамарський? / Л. Череватенко // KINO-КОЛО. – 2001. – Осінь (11). – С. 49–63. Вернуться к статье
5. Безручко, О. В. Педагогічний метод О. П. Довженка : навч. посібник / О. В. Безручко ; Київ. міжнар. ун-т. – 2-ге вид., доп. – Київ : КиМУ, 2012. – Т. 1. – 266 с. Вернуться к статье
6. Безручко, О. В. Педагогічний метод О. П. Довженка : навч. посібник / О. В. Безручко ; Київ. міжнар. ун-т. – 2-ге вид., доп. – Київ : КиМУ, 2012. – Т. 2. – 238 с. Вернуться к статье
7. Росляк, Р. Незатребуваний потенціал / Р. Росляк // Довженко і кіно XX століття : зб. ст. – Київ : Вид. Поліграф центр «ТАТ», 2004. – С. 257–262. Вернуться к статье
8. Даведка начальніка 2-га аддзела УГБ НКВД УССР Ткачэнка аб А. Довженко // Галіновай дзяржаўны архіў Службы бяспекі Украіны (ГДА СБ Украины) (укр. – Галузевий державний архів Служби безпеки України (ГДА СБ України)). – Ф. 11: Асаблівы фонд КДБ пры Савеце Міністраў УССР. – Адзінка захоўвання С-836: Довженко Аляксандр Пятровіч, «Запарожац». – Т. 1. – С. 296. Вернуться к статье
9. Данько, Т. Майстер / Т. Данько // Новини кіноекрана. – 1984. – № 11. – С. 13. Вернуться к статье
10. Цэнтральны дзяржаўны архіў вышэйшых органаў улады і кіравання Украіны (ЦДАВО Украіны) (укр. – Центральний державний архів вищих органів влади та управління України (ЦДАВО України)). – Ф. 1238: Дзяржаўны ўкраінскі трэст кінапрамысловасці «Украінфільм» Дзяржаўнага ўсесаюзнага кінофотааб'яднання «Саюзкіно». – Вопіс 1. – Адзінка захоўвання 193: Перапіска з ВСНХ СССР, абласнымі, краявымі аддзеламі ВУФКУ, кінафабрыкі пра арганізацыю вытворчых нарад, падрыхтоўку кадраў, стварэння пры кінаінстытуце ў г. Кіеве рабочага факультэта «Украінфільма» з дзённай і вячэрняй формай вучобы. Вернуться к статье
11. Комсомолець України. – 1929. – 15 грудня. Вернуться к статье
12. ЦДАВО Украіны. – Ф. 1238: Дзяржаўны ўкраінскі трэст кінапрамысловасці «Украінфільм» Дзяржаўнага ўсесаюзнага кінофотааб'яднання «Саюзкіно». – Вопіс 1. – Адзінка захоўвання 196: Перапіска з кінатэхнікумаў, інстытутам кінематаграфіі, кінафабрыкамі пра стан і перспектывы падрыхтоўкі кадраў для ўкраінскай кінематаграфіі, адкрыццё ўсеўкраінскіх курсаў сцэнарыстаў, забеспячэнне кінафабрыкі матэрыялам, статыстычныя звесткі аб складзе кінамеханік. Вернуться к статье
13. Лейда, Д. Комуніст. Поет. Філософ / Д. Лейда // Искусство кино. – 1984. – № 10. – С. 69–72. Вернуться к статье
14. Довженко, О. З дебатів по доповіді т. Воробйова на Першому всеукраїнському з'їзді ТДРФК / О. Довженко // Кіногазета. – 1931. – № 10. Вернуться к статье

15. Довженко, О. Мовою доступною мільйонам / О. Довженко // За більшовицький фільм. – 1937. – 27 лютого. Вернуться к статье

16. Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва Украіны. (ЦДАМЛМ Украіны). (укр. – Центральний державний архів-музей літератури і мистецтва України (ЦДАМЛМ України)). – Ф. 690: Довженко Аляксандр Пятровіч. – Вопіс 4. – Адзінка захоўвання 74: Аб развіцці і праблемах савецкай кінематаграфіі на 1 з'ездзе ОДСФК, 2 з'ездзе пісьменнікаў СССР, кінастудыі «Масфільм» і інш. установах. 15 сакавіка 1931 – 10 красавіка 1935 гг. – Машынапіс. Вернуться к статье